Супрацоўніцтва. Пад старшынствам Беларусі ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў 15—16 верасня адбудзецца пасяджэнне Савета па культурным супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД, паведамілі ў Міністэрстве культуры. У склад савета ўваходзяць міністры культуры (намеснікі) краін СНД, якія прымуць удзел у пасяджэнні ў анлайн-фармаце. Пасяджэнне пройдзе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі 15 верасня. Дэлегацыя наведае 16 верасня Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», які з'яўляецца базавай арганізацыяй дзяржаў СНД па музейнай справе. Удзельнікі абмяркуюць правядзенне асноўных мерапрыемстваў у галіне культуры на 2021—2025 гады, разгледзяць план правядзення ў СНД у 2022-м годзе Года народнай творчасці і культурнай спадчыны, а таксама іншыя пытанні.